http://edoc.bseu.by

*В. А. Стасевіч, А. С. Клімовіч*

Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт
І. В. Грабянчук, БФ БДЭУ (Бабруйск)

# БАБРУЙСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (1944–1954): СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі на працягу яе гісторыі неаднаразова змяняўся. Асабліва шмат такіх змен было на працягу XX ст. Трэба заўважыць, што перыяд з 1944 па 1954 гг. у адміністрацыйна-тэрытарыяльным раяніраванні Беларусі асветлены незаслужана мала. Многім жыхарам Бабруйска і Бабруйскага раёна, асабліва маладога і сярэдняга ўзросту, мала што вядома пра Бабруйскую вобласць, якая існавала ў азначаны перыяд. Відавочна, дадзеная тэма мае значную актуальнасць для вывучэння пасляваеннага перыяду айчыннай гісторыі.

Бабруйская вобласць была ўтворана ў адпаведнасці з пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб утварэнні Бабруйскай, Гродзенскай і Полацкай абласцей у складзе Беларускай ССР» ад 20 верасня 1944 г. За аснову быў узяты вопыт акруговага дзялення рэспублікі ў 20–30-х гг. XX ст., які быў прыстасаваны да новых гістарычных умоў. Плошча новай вобласці складала 19 700 км², насельніцтва – 655 000 чалавек. Выходзіла абласная газета «Савецкая Радзіма», якая сёння з'яўляецца адной з важнейшых крыніц па гісторыі Бабруйскай вобласці.

Перад Бабруйскім абласным выканаўчым камітэтам, які ўзначаліў А. Ф. Ждановіч, і іншымі савецкімі і партыйнымі органамі стаялі складаныя задачы аднаўлення разбуранай вайной мясцовай эканомікі. На завяршаючым этапе вайны задача забеспячэння прадпрыемстваў працоўнымі рэсурсамі часта вырашалася за кошт працоўных мабілізацый. Так, толькі ў чацвёртым квартале 1944 г. на тэрыторыі Бабруйскай вобласці было мабілізавана 1930 чалавек, прычым 1350 з іх падлягалі адпраўцы на прадпрыемствы чорнай металургіі Чалябінскай вобласці. У цэлым жа задача аднаўлення эканомікі вобласці была выканана на працягу 4-й пяцігодкі (1946–1950 гг.).

Адначасова з аднаўленнем эканамічнага патэнцыялу развівалася і сацыяльная сфера. Асабліва актуальным было развіццё адукацыі.

У 1949 г. на базе Бабруйскага педагагічнага вучылішча быў заснаваны Бабруйскі дзяржаўны настаўніцкі інстытут. Заняткі ў новай навучальнай установе пачалі 196 студэнтаў. За 5 гадоў працы інстытут падрыхтаваў і выпусціў 815 настаўнікаў мовы і літаратуры (беларускай і рускай), а таксама фізікі і матэматыкі для 5–7-х класаў сямігадовых і сярэдніх школ. На жаль, Бабруйскі настаўніцкі інстытут працаваў нядоўга. Выкананню навучальных планаў і праграм спадарожнічала матэрыяльная неўладкаванасць як студэнтаў, так і выкладчыкаў. Адсутнасць жылля для выкладчыкаў не давала магчымасці інстытуту запрасіць на працу высокакваліфікаваных працаўнікоў вышэйшай школы і аб'явіць конкурс на замяшчэнне вакантных пасад. У вырашэнні гэтых пытанняў неабходна была дзейсная дапамога з боку Міністэрства асветы БССР, абласных савецкіх і партыйных арганізацый, якой Бабруйскі настаўніцкі інстытут так і не дачакаўся.

Важнай часткай культурнага пасляваеннага жыцця Бабруйска з'яўлялася дзейнасць абласнога драматычнага тэатра, які да 1949 г. стаў адным з буйнейшых у Беларусі. У яго глядацкай зале налічвалася 792 месцы. Больш умяшчальныя залы мелі толькі Дзяржаўны тэатр оперы і балета (1217) і Дзяржаўны рускі тэатр (956). Важным для таго часу было і тое, што Бабруйскі тэатр меў уласнае памяшканне. На той час нават Дзяржаўны рускі і Дзяржаўны яўрэйскі тэатры ў Мінску працавалі ў арандаваных памяшканнях.

8 студзеня 1954 г. Бабруйская вобласць была скасавана, але памяць пра яе засталася. У 2011 г. працаваў інтэрнэт-сайт, на якім можна было прагаласаваць за стварэнне Бабруйскай вобласці. Як паказала апытанне ў кам'юніці livebabruisk, з 932 апытаных 400 (43 %) лічаць, што Бабруйск стане абласным цэнтрам да 2050 г. І хто ведае, можа так яно і будзе!

*Е. С. Тимошенко*

Научный руководитель – кандидат философских наук, доцент Г. Е. Каданчик, УО БГСХА (Горки)

## СОЗДАНИЕ КЛАСТЕРНОЙ СИСТЕМЫ НА МОГИЛЕВЩИНЕ – ВЕДУЩЕЕ НАПРАВЛЕНИЕ РАЗВИТИЯ РЕГИОНАЛЬНОГО АГРОЭКОТУРИЗМА

В рамках Государственной программы развития туризма на 2011–2015 гг. намечена задача активировать развитие сельского туризма на Беларуси. Реализация программы предусматривает создание сети туристических маршрутов, основанных на природном и историко-культурном потенциале регионов.

Могилевская область – восточный регион Беларуси, обладающий значительными ресурсами для создания и продвижения национальных туров и экскурсий на внутреннем и мировом рынках. В области насчитывается 2,3 тыс. памятников истории и культуры. В государственный список историко- культурных ценностей Республики Беларусь включены 684 объекта: 334 памятника археологии, 125 – истории, 4 – искусства, 221 – архитектуры. На включение в Список объектов Всемирного наследия человечества претендует Свято-Никольский монастырь в Могилеве – памятник архитектуры барокко XVIII в. Кроме богатого историко-культурного наследия в крае живописные природные ландшафты создают условия для дальнейшего развития аграрного туризма на эколого-безопасных территориях.

В Могилевской области уже накоплен позитивный опыт создания конкурентоспособного туристического продукта и ведется работа по его дальнейшему совершенствованию. Поскольку в рамках Государственной программы акцентируется внимание на подготовке специалистов в этой области, то в частности в БГСХА планируется открыть специальность «Агроэкотуризм».

Одним из перспективных направлений развития регионального туризма является создание кластерной системы. Туристический кластер «Край жыватворных крыніц» создадут в 2013 г. в Могилевской области. Проект будет реализован по инициативе областного общественного совета и при содействии Программы поддержки Беларуси федерального правительства